# БІБЛЕЙСКІЯ АЛЮЗІІ Ў ЛІРЫЦЫ МАКСІМА ТАНКА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ВЕРША «ІУДАВЫ СЯРЭБРАНІКІ»)

***Я. П. Алёкса***
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Н. В. Заяц, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

**Анатацыя.** Праводзіцца аналіз верша Максіма Танка «Іудавы сярэбранікі». На яго матэрыяле разглядаецца такая характэрная прыкмета лірыкі паэта, як выкарыстанне біблейскіх алюзій. Паказваецца мастацкая функцыя алюзій, раскрываецца іх роля ў выяўленні ідэі твора.

**Ключавыя словы:** Максім Танк; «Іудавы сярэбранікі»; Біблія; біблейскія алюзіі.

У мастацкай спадчыне народнага паэта Беларусі Максіма Танка вельмі шмат твораў, дзе ўжываюцца біблейскія алюзіі. Алюзія – «намёк на агульнавядомы факт гістарычнага ці бытавога характару» [2, с. 20]. Лірычныя творы з адсылкамі да кніг Бібліі шырока прадстаўлены ў зборніку «Мой каўчэг». Сярод іх – верш «Іудавы сярэбранікі» (1989):

*Усё жыццё*
*Чорт-нумізмат збіраў*
*Дукаты, драхмы,*
*Шылінгі, дынары,*
*Пакуль пад дрэвам смерці*
*Не падняў*
*Іудавых*
*Сярэбранікаў пару* [3, с. 174].

Першая асацыяцыя, якая прыходзіць на думку пасля таго, як прачыташ назву, – здрада. Напэўна, аўтар хацеў падкрэсліць цану здрады.

Як сказана ў Евангеллі ад Мацвея, Іуда Іскарыёт пайшоў да першасвятароў, якія вызначылі яму трыццаць сярэбранікаў за тое, што ён выдасць Хрыста, як толькі наступіць добрая нагода для гэтага. Ужо сама назва

«Іудавы сярэбранікі» дае чытачу ключ для разумення верша, раскрывае яго тэму: здрада камусьці блізкаму, таму, хто прыгрэў і падтрымаў.

Галоўны вобраз у творы – чорт, які ўсё жыццё збіраў рознай каштоўнасці грошы і ўрэшце наткнуўся на «сярэбранікаў пару» «пад дрэвам смерці». Чорт зрадаваўся сваёй находцы, але раптам узвыў. Узвыў ад таго, абпаліў свае лапы:

*Усцешыўся…*
*Ды раптам дзіка ўзвыў,*
*Нібы схапіла*
*Вогненная зяпа.*
*Цяпер сядзіць,*
*Залезшы пад абрыў,*
*І дзьме на свае*
*Спаленыя лапы* [3, с. 174].

Чорт паўстае як канцэнтрацыя зла, нянавісці, гневу. Гэта галоўны спакушальнік з моманту стварэння свету, ад самых першых людзей, заканчваючы сучаснасцю. «Дрэва смерці» – вобраз страты збаўлення. Згоднна са Старым Запаветам, у Кнізе Быцця першыя створаныя Богам людзі Адам і Ева пакаштавалі плод, які быў строга пад забаронай. Але чорт у выглядзе змяі спакусіў іх, тым самым зачыніўшы вароты ў Рай.

У некалькіх радках верша пры дапамозе біблейскай алюзіі змясцілася, напэўна, самая вядомая гісторыя здрады. Вобраз «іудавых сярэбранікаў» – яе ўвасабленне. «Спаленыя лапы» чорта могуць сведчыць аб тым, што здрада была выкрыта.

Пасля таго, як Іуда зразумеў, што нарабіў, ён вярнуў гэтыя сарэбранікі першасвятарам. Іуда павесіўся на асіне, бо не змог перажыць сораму, які накрыў яго, калі здрада выкрылася. Усё патаемнае ўсё роўна стане яўным. Як бы чалавек ні стараўся, якія б намаганні ні прыкладаў – усё роўна хаваць сваю здраду доўга не зможа. Хрыстос, ведаючы, хто Яго павінен выдаць, маўчаў. Ён нічога не казаў, не крычаў аб гэтым на увесь свет, а прыняў. З пакорай, мудра і з любоўю да ўсіх людзей ва ўсім свеце. Здрада Іуды была раскрыта без яго ўздзелу.

Алюзія дапамагае перадаць ідэю верша: здрадзе няма даравання; плата за яе – «Іудавы сярэбраннікі» – апякаюць агнём нават чорта.

Біблейская алюзія заклікае чытача ўключыцца ў своесаблівую разумовую гульню, каб спасцігнуць сэнс твора. «Інтэлектуальнасць танкаўскай паэзіі, – заўважыў М. Арочка, – неабсяжна шырыцца, узбагачаецца энцыклапедычнай дасведчанасцю, шчодра чэрпае з агульначалавечага набытку. Выдатныя творцы культуры з усіх шырот свету, з усіх гістарычных эпох (Гамер, Авідзій, Дантэ, Скарына, Шэкспір, Рэмбрант, Мікеланджэла, Міцкевіч, Шапен, Шагал, Норвід), а таксама міфічныя багі, праведнікі, д’яблы, героі народных паданняў – усё асэнсоўваецца дзеля вельмі актуальнай праекцыі ў сучаснасць» [1, с. 339].

Верш Максіма Танка «Іудавы сярэбранікі», яркі ўзор інтэлектуальнай паэзіі і філасофскай лірыкі, прымушае чытача задумацца над узнятай паэтам праблемай, над якой можна разважаць бясконца, бо яна актуальная заўсёды.

**Бібліяграфічны спіс:**


1. Арочка, М. М. Максім Танк / М. М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. – Т. 3 : 1941–1965. – 2002. – С. 312–348.
2. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. Рагойша. – Мінск : Беларус. Энц., 2001. – 384 с.
3. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк / НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 6 : Вершы (1983–1995). – 2008. – 454 с.


## СПАЛУЧЭННЕ МІНУЛАГА І СУЧАСНАСЦІ Ў РАМАНЕ ІВАНА ШАМЯКІНА «СЭРЦА НА ДАЛОНІ»


***І. І. Андрушко***

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны*
*ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Н. В. Заяц,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*



**Анатацыя.** У артыкуле даследуецца спецыфіка мастацкага часу ў рамане І. Шамякіна «Сэрца на далоні». Аналізуецца адметнасць сумяшчэння розных часавых пластоў (ваеннага мінулага і сучаснасці). Асаблівая ўвага звяртаецца на такі мастацмі прыём, як рэтраспекцыя. Мінулае ўводзіцца ў раман праз успаміны герояў: Антона Яраша, Зосі Савіч, а таксама Клаўдзіі Сухадол.



**Ключавыя словы:** рэтраспекцыя; мастацкі час; мастацкі прыём; І. Шамякін; «Сэрца на далоні»; доктар Яраш; доктар Савіч; Зося Савіч.


У літаратуры існуе вялікая колькасць твораў, дзе сумяшчаюцца розныя часавыя пласты, шырока выкарыстоўваецца прыём рэтраспекцыі. Па такім прынцыпе пабудаваны адзін з лепшых твораў народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» (1960–1963), дзеянне у якім развіваецца паралельна ў двух часавых вымярэннях: у перыяд вайны і ў пасляcталінскія гады.